# Браты Кіцары

**ГЕРОІ ДНЯ**

**Сярод тых, хто выконваў інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане, былі два родныя браты Валерый і Віктар Кіцары, ураджэнцы невялікай вёскі Пунты Горскага сельсавета.**

Віктар Кіцар патрапіў у Афганістан у жніўні 1987 года. Служыў у верталётным палку на пасадзе старшага механіка авіяцыйнага абслугоўвання ў горадзе Джэлалабад. У маі наступнага года вярнуўся з «гарачай» камандзіроўкі. Усялякае давялося пабачыць нашаму земляку за кароткі тэрмін знаходжання ў Афганістане: і радасныя дні, і дні жалю і смутку. Віктар Пятровіч распавёў пра некалькі эпізодаў са сваёй ваеннай біяграфіі:

- Было гэта перад самым вывадам нашых войскаў з Афганістана. Мы рыхтавалі да перагону ў Саюз тэхніку – аўтамабілі ЗІЛ-131. У нас было 8 аўтамашын з апаратурай сувязі і іншым спецабсталяваннем. Паколькі я праходзіў тэрміновую службу ў якасці вадзіцеля, то меў вялікі вопыт кіравання аўтамабілем. Што было немалаважным на небяспечных горных афганскіх дарогах. Таму і сеў за руль аднаго з ЗІЛа. Калі калона была сфарміравана, мы адразу рушылі ў дарогу з Джэлалабада на Кабул. Але ў той самы дзень былі вымушаны вярнуцца на месца дыслакацыі. Калона была абстраляная «душманамі». У гэтым баі загінуў мой сябар **Вадзім Артамонаў**, разам з якім прыбылі на службу з Баравухі. Было яму ўсяго 23 гады. У земляка засталіся жонка з маленькім сынам. Гэты выпадак мяне вельмі ўразіў, таму што мы ўжо вярталіся дадому.



Валерый Кіцар



Віктар Кіцар

На трэці дзень пасля гэтага трагічнага выпадку зноў рушылі ў дарогу. Чарговы раз калону абстралялі «духі», але без стратаў мы здолелі дайсці да Кабула. Далей наш шлях праходзіў праз «Даліну смерці» ў накірунку на Пулі-Хумры. Прайшлі перавал Саланг, вышыня якога дасягала чатырох тысяч метраў над узроўнем мора. Рух на перавале рэгулюецца, таму што там ёсць тунэлі, у якіх няма вентыляцыйных шахтаў. Калі ўтвараецца затор з аўтамабіляў, то гэта можа скончыцца вельмі дрэнна.

Ужо на спуску з перавала адбылася яшчэ адна непрыемная сітуацыя. З усіх кіроўцаў у калоне быў усяго толькі адзін салдат тэрміновай службы. З ім ехаў прапаршчык **Сяргей Сямёнаў**. Малады вадзіцель не справіўся з кіраваннем і ўрэзаўся ў «адбойнік», што выратавала абодвух ад смерці. Цудам яны не зваліліся ў бездань. Са шматлікімі пераломамі пацярпелых на «вяртушцы» эвакуіравалі ў шпіталь. Аўтамабіль узялі на счэпку, кідаць яго было небяспечна па прычыне таго, што ў ім знаходзілася сакрэтнае абсталяванне.

На некалькі гадоў раней за Віктара інтэрнацыянальны абавязяку Афганістане выконваў яго старэйшы брат **Валерый**. Крыху больш за два гады ён служыў на пасадзе камандзіра роты ў аўтамабільным батальёне на поўначы Афганістана ў горадзе Пулі-Хумры. У 1983 годзе быў паранены. Па вяртанні з Афганістана працягваў службу на камандных пасадах ва Узброеных Сілах. Палкоўнік запасу. Узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені і шэрагам медалёў.

**Валерый ТУХТА**